# РЭФЕРАТ

Справаздача 130 с., 1 кн., 7 табл., 133 крыніцы.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ, ЗАПАЗЫЧАННЕ, ЗАПАЗЫЧВАННЕ, ЛІНГВІСТЫЧНАЯ БЯСПЕКА, МОЎНАЯ ГЛАБАЛІЗАЦЫЯ, МОЎНЫ КАНТАКТ.

Мэта даследавання – раскрыццё сутнасці і асаблівасцей лінгвістычнай бяспекі ва ўмовах экспаніі іншамоўнай лексікі, а таксама вызначэнне асноўных напрамкаў моўнага будаўніцтва падчас глабалізацыі.

Аб’ект даследавання – лінгвістычная бяспека ва ўмовах глабалізацыі.

Прадмет даследавання – асаблівасці рэалізацыі лінгвістычнай бяспекі ў дачыненні сучаснай беларускай мовы.

Метады даследавання – апісальны, супастаўляльны, колькасныя падлікі.

У ходзе работы праводзілася выбарка і сістэматызацыя іншамоўных запазычанняў з медыяпартала zviazda.by.

У выніку даследавання выяўлены асноўныя падыходы да паняцця “лінгвістычная бяспека”; вызначана сутнасць лінгвістычнай бяспекі ва ўмовах глабалізацыі; выяўлены асноўныя мовы-крыніцы для беларускай мовы на сучасным этапе. вызначаны асноўныя выклікі і пагрозы экспансіі іншамоўных адзінак; вылучаны асноўныя напрамкі моўнага будаўніцтва ў галіне кантактаў з іншымі мовамі ў сучасных умовах.

Ступень укаранення – метадычная распрацоўка“The Process of Globalization in the Works by Ulrich Beck and Anthony Giddens” («Працэс глабалізацыі ў работах Ульрыха Бэка і Энтані Гідэнса») укаранёна ў адукацыйны працэс БрДУ імя А.С. Пушкіна (пратакол № 3 ад 23.09.2022); метадычная распрацоўка «Научные парадигмы в лингвистике. Экологическая парадигма» ўкаранёна ў адукацыйны працэс БрДУ імя А.С. Пушкіна (пратакол № 2 ад 12.06.2023); распрацоўка «Слоўнік іншамоўных слоў беларускай мовы» ўкаранёна ў адукацыйны працэс БрДУ імя А.С. Пушкіна (пратакол № 3 ад 25.09.2023).